## Фотапраекцыя




**Фотавыстаўкай “Ступені” ў сталічнай галерэі “Універсітэт культуры” адкрыўся Першы Мінскі фестываль фатаграфіі. Пяць экспазіцый на розных пляцоўках беларускай сталіцы, Міжнародная канферэнцыя “Фатаграфія ў краінах Усходняга партнёрства: праблемы і вырашэнні” ў Інстытуце журналістыкі БДУ — першы форум, зладжаны Беларускім грамадскім аб’яднаннем “Фотамастацтва” прапаноўвае шэраг ініцыятыў з мэтай адлюстравання сучаснага стану беларускай фатаграфіі.**

Першая фотавыстаўка — “Ступені” — на думку старшыні БГА “Фотамастацтва” Сяргея Плыткевіча, з’яўляецца адным з найбольш знакавых мерапрыемстваў. “Яна ўвойдзе ў гісторыю. Менавіта з ёю будуць параўноўваць усе наступныя фотапраекты нашага аб’яднання”, — падкрэсліў ён, адзначыўшы і колькасць прадстаўленых на ёй работ (больш за сто пяцьдзясят), і колькасць аўтараў, якія прынялі ўдзел у выстаўцы, (пяцьдзясят два).

Усім членам “Фотамастацтва” было прапанавана даслаць лепшыя, на іх думку, уласныя серыі работ у Савет аб’яднання, і апошні з той тысячнай колькасці здымкаў выбраў фатаграфіі, што прадстаўлены зараз у экспазіцыі.